Асалода чытання

Якой быць «Народнай бібліятэцы» беларускай кнігі?

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» не перастае здзіўляць новымі кніжнымі праектамі, новымі ідэямі, якія вартыя ўвагі, як мне падаецца, кожнага чытача нашай краіны, хто бачыць асалоду ў чытанні на роднай беларускай мове. Здаецца, зусім нядаўна пачала выходзіць анталогія казак з розных нацыянальных літаратур свету, з розных фальклорных скарбонак у дванаццаці тамах — «Дванаццаць месяцаў», а вось ужо і новы праект прапануюць беларускія выдаўцы. Пра гэта і пойдзе наша размова з дырэктарам выдавецтва — вядомым пісьменнікам, лаўрэатам многіх прэстыжных літаратурных прэмій Беларусі і Расіі Алесем БАДАКОМ.

— Алесь Мікалаевіч, ведаю, што збіраецеся выдаваць адмысловую бібліятэку класікі...

— Выдавецтва «Мастацкая літаратура» распачынае кніжны праект «Народная бібліятэка», у выніку якога будзе выдадзена цэлая бібліятэчка выбраных твораў беларускіх класікаў. Ідэя праекта заключаецца ў тым, што змест кніг складуць творы, якія прапануюць уключыць самі чытачы...

— Няўжо такая зваротная сувязь можа быць аб'ектыўная?..

— Мы перакананы ў тым, што якраз такая сувязь і стане аб'ектыўнай адзнакай таго, што ж запатрабавана чытачом... Свае меркаванні адносна вартасцяў класічнай літаратуры выкладуць настаўнікі, студэнты, ды, канешне ж, пісьменнікі, навукоўцы, бібліятэкары і г. д. Праз сацыяльныя сеткі мы неўзабаве пачнём інтэрнэт-галасаванне, удзельнічаць у якім зможа кожны, хто падаецца. Будзем рады, калі інфармацыйную падтрымку нам акажа «Выдавецкі дом «Звязда», вакол выданняў якога гуртуюцца шматлікія творчыя сілы і звычайныя чытачы, якія цікавяцца беларускай літаратурай.

Дзякуючы гэтай акцыі можна будзе зрабіць выснову, якія творы айчыннай класікі сёння, часам нават праз сто і больш гадоў пасля свайго напісання, карыстаюцца любоўю беларусаў. А заадно звярнуць увагу на гэтыя творы тых чытачоў — як беларускіх, так і замежных, — хто на сённяшні дзень не вельмі лёгка арыентуецца ў нашым багатым і разнастайным прыгожым пісьменстве.

— Тут, сапраўды, вы кіруецеся кнігагандлёвым маркетынгам... Час паказвае, што ў многіх выпадках да знаёмства з класікай прыходзяць і новыя чытачы...

— Ёсць нават такая статыстыка. Лічыцца, што не менш як трыццаць працэнтаў чытачоў якраз тыя, хто выбірае кнігі ў кнігарні ці бібліятэцы дзякуючы чыімсьці падказкам і чужым арыенцірам. Мне здаецца, што ў дачыненні да беларускай літаратуры такі працэнт яшчэ вышэйшы.

— Хоць добра было б правесці сапраўднае сацыялагічнае даследаванне адносна таго, якія кнігі выбіраюць айчынныя чытачы. Ёсць, праўда, рэйтынгі, якія штомесяц складаюць у ААТ «Белкніга». І на крайні выпадак мы ведаем, якія кнігі беларускай вытворчасці, якія кнігі на беларускай мове найболей набываюць беларусы...

— І я заўсёды з вялікай цікавасцю праглядаю гэтыя рэйтынгі, за падрыхтоўку якіх надзвычай удзячны супрацоўнікам «Белкнігі». Усё ж такі важна ведаць, што найболей часта купляюць у 101 іх кнігарні. Але ж, сапраўды, патрэбна болей грунтоўнае даследаванне, калі хочаце, чытацкага попыту. Якія інстытуты за гэта гатовы ўзяцца — асабіста я не ведаю...

Другая мэта «Народнай бібліятэкі» — даведацца, з якіх імёнаў, на думку нашых сучаснікаў, сёння павінен складацца наш класічны літаратурны пантэон, каго сёння беларусы лічаць класікамі, якіх варта хоць зрэдку перачытваць. Мне здаецца, што вынікі такога народнага галасавання будуць цікавыя ўсім — не толькі звычайным чытачам, а таксама нашым літаратуразнаўцам, выкладчыкам.

— Ці не пахіснуцца пэўныя асновы ўяўленняў пра класіку, якія ствараюцца ў нашай свядомасці, пачынаючы ад школьных падручнікаў?..

— Не магу пагадзіцца з такім меркаваннем. Стварэнне «Народнай бібліятэкі» на аснове рэальных чытацкіх зацікаўленняў — гэта ні ў якім разе не жаданне нейкім чынам прарэвізаваць нашу класіку: паўтаруся, размова ідзе пра імкненне зразумець, хто і што сёння карыстаецца народнай любоўю. Калісьці беларускія сяляне, сучаснікі Францішка Багушэвіча, хавалі яго кнігі за абразамі, а калі ён памёр, чатырнаццаць кіламетраў пры вялікім веснавым разводдзі неслі на сваіх плячах цела нябожчыка, каб перадаць яго роднай зямлі. Канешне, сёння творы Багушэвіча не карыстаюцца такой папулярнасцю, як тады, але праз гэта яны не сталі менш класічнымі. Таму іх праходзяць у школе, у гуманітарных ВНУ, што абсалютна справядліва. Але мне здаецца, што ў нашым жаданні паказаць нейкія літаратурныя арыенціры, не абмяжоўваючыся толькі школьнай ці ўніверсітэцкай праграмай, таксама ёсць свая логіка і патрэба. Гэта датычыцца і імёнаў, і канкрэтных твораў. Адна справа, калі гаворка ідзе пра Івана Мележа: зразумела, што пераважная большасць чытачоў сваім любімым творам назаве «Людзей на балоце». А задайце тое ж пытанне ў дачыненні да творчасці Максіма Гарэцкага, Кузьмы Чорнага — я думаю, прадказаць вынікі апытання тут будзе нашмат складаней. Ды я не спяшаўся б рабіць нейкія дакладныя прагнозы і ў дачыненні да твораў Івана Шамякіна альбо Васіля Быкава.

— З чаго пачнецца «Народная бібліятэка»?..

— Першымі кнігамі выбраных твораў у нас выйдуць том Максіма Багдановіча і двухтомнікі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Тут, думаю, ні ў кога пярэчанняў не будзе: гэта, як кажуць расіяне пра Пушкіна, «наша ўсё».

Мы будзем старацца, каб гэта былі падарункавыя ілюстраваныя выданні, выкананыя ў адным мастацкім стылі, з арыгінальным дызайнам і не вельмі дарагія. Выданні, якія не сорамна падарыць, у тым ліку замежным гасцям: найперш нашым замежным суайчыннікам.

— Тады, відавочна, трэба будзе дбаць і пра істотныя тыражы...

— Так. І ў гэтым вельмі спадзяёмся на ўсю чытацкую супольнасць, на яе адкрытыя і шчырыя меркаванні.

Гутарыў Мікола БЕРЛЕЖ.

Ёсць такі праект

ПРАДЧУВАННЕ ЗІМОВЫХ ЦУДАЎ

У Нацыянальным гістарычным музеі адкрыўся традыцыйны навагодні выставачны праект «Музей ёлачных цацак». Тут дзеці і дарослыя могуць убачыць навагоднія дэкарацыі з Еўропы, Азіі, Аўстраліі, Амерыкі, Афрыкі, аналагаў якім няма ні ў адным еўрапейскім музеі.

— Праект у сценах музея існуе з 2014 года. Ідэя ўзнікла падчас маіх вандровак па свеце, у якіх я зацікавіўся ёлачнымі цацкамі і пачаў іх калекцыянаваць. Спачатку яны зберагаліся ў мяне дома, а потым узнікла думка: можна арганізаваць такі вось «Музей ёлачных цацак». Зрабілі першую выстаўку. Яна адразу выклікала вялікую цікавасць з боку наведвальнікаў, таму вырашылі паўтараць яе штогод, — дзеліцца **калекцыянер і арганізатар выстаўкі Андрэй БЯГУН.** — А пасля з'явілася жаданне арганізаваць вытворчасць ёлачных цацак, бо людзі хацелі набыць нешта сваё, беларускае. Так маё хобі ператварылася ў справу жыцця. Я з цеплынёй успамінаю ёлачныя цацкі з майго дзяцінства, якія былі ў бабулі. І, вядома, кожная цацка з калекцыі мне таксама дарагая, бо за ёй — гісторыі і дарагія ўспаміны. Кожны раз, калі некуды прыязджаю, імкнуся знайсці экспанаты, якімі змагу папоўніць і разнастаіць калекцыю.

Кожны год «Музей ёлачных цацак» абнаўляе свае фонды, што дазваляе кожны раз наведваць выстаўку нібы ўпершыню. Завітаўшы сюды, дзіця трапіць у чароўную казку, а дарослы — вернецца ў далёкае дзяцінства. Экспазіцыя расказвае аб гісторыі вытворчасці шкляных шароў і іншых упрыгажэнняў з сярэдзіны XIX стагоддзя да нашых дзён і знаёміць з традыцыямі навагодніх свят такіх экзатычных краін, як Конга, Перу, Інданезія, Новая Зеландыя, Паўночная Карэя і многіх іншых.

Праект рэалізуецца сумесна з фабрыкай ёлачных цацак «ГРАЙ» («Ганарыся Рэчамі АЙчыны!»). Сёння тут прапануюць вялікі асартымент вырабаў. Ёсць, напрыклад, цацкі з дрэва, што і танна, і экалагічна, з полікерамікі, шкляныя шары з барэльефам. Выбар на любы густ, але галоўнае, з акцэнтам на нашы традыцыі. Наведвальнікі музея змогуць даведацца пра ўсе сакрэты вытворчасці ёлачных цацак на адзінай у Беларусі спецыялізаванай фабрыцы, а таксама пад кіраўніцтвам мастакоў прадпрыемства прайсці адукацыйныя майстар-класы па вырабе навагодніх аздабленняў, і не толькі.

Самыя маленькія госці выстаўкі ўбачаць мініяцюрны інтэрактыўны калядны гарадок. Можна завітаць і ў фірменную краму фабрыкі «ГРАЙ», а там набыць святочную прадукцыю па фабрычных цэнах. Кошт квіткоў і расклад работы ўдакладняйце ў музеі.

Перакананы, што наведванне выстаўкі стане запамінальным святам для дзяцей і дарослых напярэдадні Новага года.

Алена ДРАПКО.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.